

Газета Слонімская

Масава-палітычны штотыднёвік

Упершыню выйшла ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Выдавец УП "Газета Слонімская" Выходзіць адзін раз на тыдзень Заснавана 24 сакавіка 1997 года

№21 (363) Серада, 19 траўня 2004 года gs.promedia.by

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы, іншыя гарады Беларусі, а таксама на HTTP://gs.promedia.by

СВЯТА

20 ТРАЎНЯ – ДЗЕНЬ З'ЯЎЛЕННЯ ЖЫРОВІЦКАГА АБРАЗА МАЦІ БОЖАЙ



Фота з архіва "ГС"

■ Вынас з храма Жыровіцкага абраза Маці Божай, 20 траўня 2000 г.

Штогод 20 траўня ў Жыровічах адзначаецца свята з'яўлення Жыровіцкага абраза Маці Божай. У гэты дзень Жыровічы наведваюць тысячы праваслаўных вернікаў.

Паводле царкоўнага падання, абраз з'явіўся дзесьці ў 1470 годзе на грушы-дзічцы. Яго знайшлі пастушкі мясцовага пана Аляксандра Солтана. Яны прыйшлі папіць вады да крыніцы. Падыходзяць і бачаць дзіва-дзіўнае: з грушы зыходзіць ззянне чароўнае – ад абразка. Аднеслі яны абразок Солтану, той яго ў куфэрачак схаваў. А вечарам намерыўся гасцям паказаць. Адкрыў куфэрак – а там пуста.

На другі дзень пастушкі зноў пайшлі напіцца вады і зноў убачылі ікону Божай Маці на грушы. Пасля гэтага Солтан пабудаваў на тым месцы драўляную царкву, куды і перанеслі ікону з мясцовага жыровіцкага храма, дзе яна спачатку захоўвалася. З цягам часу вакол царквы пачалі сяліцца людзі. Пазней там і манастыр з'явіўся. Колішнія Жыровічы ў той час былі на адлегласці вярсты са тры ад цяперашняга мястэчка, але хутка там ўсё прыйшло ў заняпад, і цэнтр утварыўся вакол манастыра. Так сведчыць паданне.

Пакланіцца Жыровіцкаму абразу Маці Божай прыязджалі людзі розных саслоўяў, у тым ліку і каралі Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV, Ян III Сабескі, Аўгуст II, Станіслаў Аўгуст Панятоўскі ды іншыя вялікія асобы. У 1730 годзе на абраз ўсклалі прывезеныя з Рыма кароны, зрабілі аправу, кароны аздобілі каштоўнымі камянямі, падараванымі Ганнай Сангушкай.

У 1660 годзе абраз вывозілі ў Быценскі кляштар базыльян, а ў 1915 – у Маскву, адкуль ён вярнуўся без большай часткі аздаблення. А ў першай палове XVI стагоддзя яго пашкодзіў пажар. Тым не менш абразок Жыровіцкай Божай Маці захаваўся, і цяпер ён знаходзіцца ва Успенскім саборы манастыра. 20 траўня там і адбываюцца ўсе ўрачыстасці з нагоды з'яўлення гэтай цудатворнай іконы.

Сяргей ЧЫГРЫН

ПОСЛЕ ПРОВЕРКИ

НАЛОГИ – ДЕЛО СЕРЬЁЗНОЕ

Похоже, что главного бухгалтера Слонимского винодельческого завода подвела должностная недобросовестность.

В ходе проверки выяснилось, что в течение полутора лет она столь небрежно относилась к исчислению и уплате налогов, что в результате причинила государству ущерб в размере 45,6 миллиона рублей.

По этому факту возбуждено дело по статье Уголовного кодекса, предусматривающей наказание за служебную халатность.

Об этом сообщила газета "Советская Белоруссия".

Сергей ЧИГРИН

ЗДАРЭННІ

УКРАЎ ВАЛЮТУ

3 кватэры слонімца С., што жыве на Паркавай вуліцы, на мінулым тыдні зніклі каля 100 еўра.

Работнікі міліцыі хутка ўстанавілі, што валюту ў сталага чалавека "пазычыў" раней падсудны мясцовы жыхар.

І МУЗЫКА НЕ ГУЧЫЦЬ

Па-ранейшаму не абмінаюць зладзеі пакінутыя без нагляду аўтамабілі.

Днямі з прыватнага легкавіка, прыпаркаванага на праспекце Незалежнасці, укралі аўтамагнітолу. Аналагічнае здарэнне адбылося і на вуліцы Тапалёвай.

На злодзея, які пагаспадарыў у чужым аўтамабілі на вуліцы Тапалёвай, аператыўнікі хутка выйшлі. А вось хто залез у легкавік на праспекце Незалежнасці, пакуль невядома.

Мікола КАНАНОВІЧ

ПАЦЯРПЕЎ МАТАЦЫКЛІСТ

У мінулую суботнюю ноч матацыкліст не прапусціў аўтамабіля і выехаў на праезджую частку дарогі.

Адбылося сутыкненне, у выніку якога моцныя траўмы атрымаў матацыкліст. Яго завезлі ў бальніцу.

Сяргей ЧЫГРЫН

ИНФОРМАЦИЯ К СВЕДЕНИЮ

ВНИМАНИЕ! ДЕТИ НА ДОРОГАХ!

28 мая, в пятницу, сотрудники Слонимской госавтоинспекции проведут единый день безопасности дорожного движения под девизом "На дороге дети – мы за них в ответе!".

Это мероприятие приурочено к наступающим школьным каникулам.

Инспектора Слонимской госавтоинспекции проведут лекции на тему безопасности на дорогах в школах города и района.

Сотрудники госавтоинспекции также призывают водителей быть более бдительными.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ОПРОС

ЖИВЁМ НОРМАЛЬНО, НО ДЕНЕГ НЕ ХВАТАЕТ

Беларусь – единственная из стран Содружества независимых государств, промышленное производство которой достигло уровня докризисного 1990 года.

Такую "радостную" новость сообщили на минувшей неделе государственные средства массовой информации. Согласно ей, в сравнении с 1990 годом доходы белорусов увеличились более чем наполовину. И основным доходом для большинства жителей нашей страны является заработная плата, по среднему уровню которой Беларусь, с суммой в 140 долларов в эквиваленте, занимает третье место в СНГ – после России и Казахстана.


Почувствовали ли себя слонимчане в связи с этим более уверенными и состоятельными? С этими вопросами корреспондент "ГС" обратилась к жителям нашего города.

СЕРГЕЙ, РАБОТАЕТ НА ГОСУДАРСТВЕННОМ ПРЕДПРИЯТИИ:



– Да, мои доходы немного увеличились. Не скажу, что существенно, но на жизнь все равно не хватает: коммунальные платежи, расходы на еду и алименты первой жене съедают почти весь заработок.

МАТЬ ЧЕТВЕРЫХ ДЕТЕЙ (НАЗВАТЬСЯ НЕ ЗАХОТЕЛА):




– Мне трудно об этом говорить. Я не работаю, у меня ребенок-инвалид, сижу с ним. На жизнь катастрофически не хватает, помощи от государства – никакой. Пособие на детей просто смешное.

ВИТАЛИЙ:



– Материальное положение у меня нормальное. Правда, денег на жизнь все равно не хватает. Живу на пособие по инвалидности. И если бы жил не вместе с родителями, просто не знал бы, что делать.

ТАТЬЯНА АЛЕКСАНДРОВНА:



– Можно сказать, я живу так, как средний белорус. У меня муж военный пенсионер и при этом работает, и я работаю. У нас старший сын уже живет отдельно, так что на троих денег хватает. Но по сравнению с началом 90-ых, мне кажется, жить мы стали гораздо хуже. Это вне всякого сомнения. Раньше за те деньги можно было прожить гораздо лучше.

ОЛЬГА:



– Не знаю, что и сказать. Я работаю у частного предпринимателя в фермерском хозяйстве, зарабатываю мало. У меня двое детей. Одеть, обуть и прокормить их очень непросто. На все это денег не хватает, сами понимаете. Я начала работать с 1993 года, и тогда я чувствовала себя намного увереннее. Могла поехать в тот же город, купить себе все, что хочу. Сейчас так уже не получается...

МУЖЧИНА, СТРОИТЕЛЬ:



– Мое материальное положение в пределах допустимого. На жизнь мне хватает, я – холостяк. Конечно, в 90-х было лучше. Сейчас положение людей с каждым годом все ухудшается и ухудшается, а надежды на лучшее нет.

Янина МЕЛЬНИКОВА

ГАИ СООБЩАЕТ

ВСЁ О ТЕХОСМОТРЕ

ГДЕ ПРОВОДИТСЯ

Технический осмотр (ТО) автомобилей проводится на диагностических станциях и пунктах технического контроля, имеющих на это соответствующее разрешение.

В связи с новыми правилами проведения технического осмотра, которые вступили в силу с 1 июля 2003 года, ТО можно пройти вне зависимости от места регистрации транспортного средства, то есть в любом городе Беларуси. Это касается инструментального ТО. А документальный техосмотр проводится только по месту регистрации автомобиля.

"В нашем городе ТО проводится на диагностической станции (возле авторемонтного завода), в автопарке №3, в ГАП-11", – сообщил инспектор Слонимского отделения ГАИ Вячеслав Ильин.

ЧТО ТРЕБУЕТСЯ

ТО включает в себя инструментальный и документальный контроль транспортного средства.

Поэтому, отправляясь на техосмотр, возьмите с собой следующие документы:

1) паспорт;

2) доверенность на авто (если вы не являетесь собственником транспортного средства);

3) водительское удостоверение, талон;

4) свидетельство о регистрации машины (техпаспорт);

5) сертификат о прохождении ТО;

6) страховое свидетельство;

7) медицинскую справку;

8) разрешение на средства связи (если в авто есть рация).

Техосмотр проводится со 2 января по 30 декабря. Во время прохождения техосмотра, по словам инспектора Слонимского отделения ГАИ Вячеслава Ильина, сверяются цвет, год выпуска, идентификационный номер (номер кузова, регистрационные знаки) транспортного средства. На транспортном средстве должен быть отличительный знак страны регистрации – BY.

СРОКИ ПРОХОЖДЕНИЯ

Если вашему автомобилю 10 и более лет, включая год выпуска, техосмотр проводится 1 раз в год. Ну а если авто не старше 10 лет, то ТО можно проходить один раз в два года.

Владельцы машин такси, автобусов, грузовых авто, оборудованных для перевозки людей, а также машин, перевозящих опасные грузы, должны проходить ТО два раза в год.

РАСЦЕНКИ

Во всех пунктах прохождения ТО в нашем городе действуют одинаковые расценки как на инструментальный, так и документальный осмотр. Плата за техосмотр производится по месту его прохождения.

- 13 190 рублей – за легковой автомобиль;
- 19 890 рублей – за двухосный грузовой автомобиль;
- 22 570 рублей – за трехосный грузовой автомобиль;
- 6 940 рублей – за одноосный грузовой прицеп;
- 9 620 рублей – за двухосный грузовой прицеп;
- 12 300 рублей – за трехосный грузовой прицеп;
- 7 840 рублей – за мотоцикл (без коляски и с коляской);
- 5 600 рублей – за легковой прицеп.

Подготовила Ольга ШИНКЕВИЧ

ИНФОРМАЦИЯ

СЛОНИМСКИЙ РЫНОК ЦЕНЫ НА ПРОДУКТЫ

18.05.2004 г.

Наименование	Цена за 1 кг
Молоко (1 л)	600 руб.
Творог	3 000 руб.
Масло	6 000 руб.
Яйца (1 дес.)	1000 - 1 550 руб.
Картофель	700 - 2 000 руб. за ведро
Капуста свежая	1 700 - 2 000 руб.
Морковь	400 - 500 руб.
Лук	600 - 1 300 руб.
Свёкла	350 руб.
Чеснок	150 - 250 руб. за головку
Помидоры	3 000 - 3 500 руб.
Огурцы	2 800 - 3 500 руб.
Яблоки	1 500 - 2 800 руб.
Апельсины	2 100 - 3 500 руб.
Мандарины	3 000 - 3 400 руб.
Лимоны	2 500 - 3 300 руб.
Киви	550 руб. шт.
Гранаты	5 000 руб.
Бананы	2 400 руб.
Свинина	4 500 - 8 800 руб.
Говядина	500 – 5 800 руб.
Телятина	–
Сало свежее	2 600 - 3 900 руб.
солёное	3 900 - 4 800 руб.
Селёдка	3 200 руб.
Макаронные изделия	1 150 - 1 400 руб.
Гречка	1 200 - 1 700 руб.
Рис	1 300 - 1 500 руб.
Мука	2 100 руб. (2 кг)
Сахар	не продаётся
Подсолнечное масло. (1 л)	1 900 - 2 600 руб.
Мёд	12 000 руб.

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ

18.05.2004 г.

"Беларусбанк"

	Покупка	Продажа
1 USD	2130	1175
1 EURO	2500	2630
1 ZL	480	550
1 RUR	72.50	75

"Белпромстройбанк"

	Покупка	Продажа
1 USD	2135	2170
1 EURO	2530	2615
1 ZL	520	555
1 RUR	73,5	74,9

"Белагропромбанк"

	Покупка	Продажа
1 USD	2140	2175
1 EURO	2500	2610
1 ZL	450	570
1 LAT	3800	4050
1 LIT	600	780
1 UAH	370	420
1 GBP	3700	3900
1 RUR	69	75

Нацбанк РБ

1 USD	2155
1 EURO	2595,59
1 RUR	75.37

КРЫМІНАЛ

ВЫМАНІЛА 700 ДАЛЯРАЎ

Раней падсудная беспрацоўная 50-гадовая сланімчанка згуляла на даверы дзвюх мясцовых жанчын, якія хацелі выехаць на заробкі за мяжу.

Ашуканка назвала сябе супрацоўніцай прэстыжнай гродзенскай фірмы і выманіла ў адной жанчыны 100 даляраў, а ў другой ажно 600.

Махлярку арыштавала міліцыя. Аднак пацярпелым ад яе падману жанчынам ад гэтага мала радасці, бо ілжэпрадпрымальніца да таго часу ўжо паспела патраціць іх грошы.

Мікола КАНАНОВІЧ

ВЁСКА

ХТО СЁННЯ ГАСПАДАР НА СЯЛЕ?

“Усё жыццё на тэрыторыі сельсавета праходзіць праз прызму выканкама сельскага Савета,” — сказаў у гутарцы з карэспандэнтам “ГС” старшыня выканкама Васілевіцкага сельсавета Васіль Падрэцкі.

Калі канкрэтна, то гэта закуп малака ў насельніцтва, падзел прысядзібных участкаў, клопат пра ветэранаў вайны і працы, пенсіянераў, добраўпарадкаванне і падтрымка ў належным стане гістарычных помнікаў, абеліскаў, брацкіх магіл, а таксама месцаў агульнага карыстання ў населеных пунктах ды кантроль за парадкам на вясковых падворках.

Падтрымліваць парадак у вёсках — справа не такая і простая, як можа падацца на першы погляд. На думку Васіля Падрэцкага, для гэтага патрэбна хаця б невялікае фінансаванне. Па яго словах, у мінулым годзе, калі ў Васілевіцкім сельсавеце ліквідавалі вясковыя звалкі, райінспекцыя прыродных рэсурсаў і аховы акаляючага асяроддзя выдаткавала на гэтую справу прыкладна 1,5 мільёна рублёў. Тады смецце з вёсак вывезлі на абсталяваную афіцыйную звалку.

“Я быў задаволены, што гэтая праца зроблена. Прайшоў час — ужо хутка год — на звалцы трэба падгортваць смецце, падтрымліваць парадак, а няма каму. Звярнуўся ў ахову прыроды з пытаннем, ці можна нейкім чынам прыцягнуць да гэтай справы СВК. Адказалі, што нельга. Сельгаскааператыў не мае ліцэнзіі, проста не мае права нават накіраваць туды свой трактар... Хаця мы ўсё роўна просім старшыню СВК дапамагчы ў гэтым... Я лічу, што прадпрыемствы, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета, і ў першую чаргу СВК, павінны хаця б раз у месяц выдзяляць тэхніку для ўборкі месцаў агульнага карыстання. І каб яны не мелі права нам адмовіць. А так, што ж, мы просім, а там салыркі няма, тэхнікі няма. І мы застаемся адзін на адзін з праблемамі...” — дзяліўся сваімі думкамі старшыня сельскага выканкама Васіль Падрэцкі.


Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

■ У Васілевічах напярэдадні Дня Перамогі

Яшчэ адна праблема на вёсцы — лазні. У тым жа Высілевіцкім сельсавеце лазні засталіся фактычна без гаспадара. Па рашэнні раённых уладаў лазні павінны адысці пад юрысдыкцыю сельсаветаў. Аднак сельскі выканкам не прыняў іх на свой баланс, а сельгаскааператыў (былы калгас-уладальнік) як быццам ужо і аддаў.

“Санстанцыя патрабуе ад нас: вы павінны прыняць лазні! Але ж прыняцце на свой баланс будынка і маёмасці патрабуе нейкага фінансавання. Таму мы лазняў не прынялі, і яны фактычна застаюцца за калгасам. І наогул, я лічу, што выбіванне калгасаў з сацыяльнай сферы — гэта няправільна. Таму што ў вёсцы жывуць людзі, якія ў сваёй большасці працуюць у сельгаспрадпрыемствах, і гэтыя перадачы маёмасці даюць гаспадаркам падставу нічога не рабіць, каб працавала тая ж лазня, бо яна ўжо сельсавецкая. А сельсавету, у сваю чаргу, таксама нічога не далі. Вось і атрымліваецца, што, калі дрэнна — гэта сельсавет, а калі добра... хто-небудзь іншы”, — заўважыў Васіль Іосіфавіч.

Вёскі Васілевічы, Парэчча, Задвор’е, Бабынічы, па якіх давялося нядаўна праехаць, пакінулі прыемнае ўражанне сваёй дагледжанасцю. Таксама там паміж большасці стандартных вясковых хат сустракаюцца і вельмі арыгінальныя дамы і падворкі, гаспадары якіх, бясспрэчна, маюць добры эстэтычны густ і адпаведна сродкі для рэалізацыі такіх архітэктурных праектаў. Пашчасціла жыхарам гэтых вёсак і ў тым, што ў свой час да іх дамоў падвялі газ і праклалі водаправод. Праўда, за такія гарадскія выгоды ў вёсцы цяпер трэба нямала плаціць. Тым не менш альтэрнатыўнае дрывам паліва і ваду ў хаце маюць сёння зусім не многія вясковыя жыхары Слонімшчыны.

Прыгажосць тамтэйшых прырэчных мясцін прыцягвае ў сезон аматараў адпачыць на прыродзе. Мясціны ў Васілевіцкім сельсавеце, сапраўды, цудоўныя для жыцця і адпачынку. А вось на вынесенае ў загалоўку пытанне, хто сёння гаспадар на сяле, адказаць адназначна нельга. Да месца тут будзе, хутчэй, множны лік: старшыня сельскага выканкама — гаспадар на сваім месцы, старшыня сельгаскааператыва — на сваім, а кожны вясковец — гаспадар на сваім падворку. І, як кажуць, дай божа, каб паміж імі былі лад і згода.

Мікола КАНАНОВІЧ

Наш Web-адрес
http://gs.promedia.by

БЕЗОПАСНОСТЬ

УКРОЩЕНИЕ ОГНЯ — ЗАНЯТИЕ НЕЛЕГКОЕ


Фота Яніны МЕЛЬНІКАВАЙ

■ Юные пожарники борются с огнём

"Осторожнее! Не гони! Будь внимательным!" — кричал вслед своим воспитанникам руководитель кружка юных спасателей Анатолий Олешко. А мальчишки из 4-го класса только быстро и уверенно преодолевали препятствие за препятствием.

Они самые маленькие, но отнюдь не самые слабые участники соревнований по пожарной подготовке среди учащихся школ района. Их соперники — ученики 10-11-х классов восьми школ — готовились к соревнованиям только неделю. Кружковцы учатся быть ответственными за свою безопасность и безопасность своих сверстников с сентября прошлого года. Анатолий Леонтьевич считает, что этот возраст самый благодарный. Конечно, нелегко приходится при объяснении ребятам принципов химических реакций и электрических импульсов, но зато навыки, которые получают мальчишки на таких занятиях, просто бесценны. Сначала в кружок записалось много школьников, даже девочки были, потом остались только самые выносливые и самые упорные.

Конечно, юные кружковцы не заняли в соревнованиях первого места, лучшими стали ребята из команды школы №8, но полосу препятствий пробежали, что называется, без сучка без задоринки.

А вот команде школы №10 не повезло: один из ее участников из-за сильного ветра не удержался и сорвался с бруса. Пришлось даже вызвать "скорую помощь". Как говорят организаторы этого мероприятия из управления образования и МЧС, такие соревнования редко обходятся без травм. Но отменять их никто не собирается — слишком важны они для школьников. Ведь из программы обучения уже несколько лет как исключили такой предмет, как "Охрана безопасности жизнедеятельности".

Самым сложным из пяти этапов полосы препятствий, по мнению организаторов, было разветвление (присоединение ствола к "рукаву" — так называется пожарный шланг). Ребята путались в нем, теряя драгоценные секунды. Нелегко приходилось и на этапе тушения, где участники соревнования должны были затушить открытый огонь химическим пенным огнетушителем. Языки пламени то и дело вспыхивали в, казалось бы, уже потушенной смеси воды и бензина. А вот по мнению ребят, самым трудным оказался именно злополучный брус. Говорят, очень сильным был боковой ветер.

И все-таки и ученики, и педагоги остались довольными показанными результатами. Очевидно, что при необходимости мальчишки не растеряются и смогут грамотно потушить огонь. Жаль только, что девчонки пока к ним не присоединяются.

Янина МЕЛЬНИКОВА

КОНКУРС

ДЕТИ РИСУЮТ ВОЙНУ

В начале мая в Минске прошел Международный конкурс детских рисунков "Земля, опаленная войной".

На конкурсе было представлено более двух тысяч работ школьников из России, Украины, Польши, Литвы, Болгарии и Беларуси. Отрадно, что в число 50-ти лучших работ попал и триптих 11-летней слонимской школьницы Насти Добриян, написанный ею по повести Василя Быкова "Альпийская баллада". Настя занимается в кружке юных художников при учреждении внешкольного воспитания и обучения "Скарбница", руководит которым Татьяна Салыго.

ТРАДЫЦЫІ

ПАВЯЗАЛІ ЧЫРВОНА-ЗЯЛЁНЫЯ ГАЛЬШТУКІ


Фота Яніны МЕЛЬНІКАВАЙ

■ А ці будуць насіць піянеры гэтыя гальштукі?

Травень, як заўсёды, выдаўся багаты на ўсемагчымыя святы.

Здаецца, толькі нядаўна адзначылі Дзень працы і Дзень Перамогі, як зноў ёсць што святкаваць. Сёмага траўня адзначылі сваё прафесійнае свята працаўнікі радыё, тэлебачання і сувязі. А 19-га — па старой савецкай традыцыі адзначаецца Дзень народзінаў піянерскай суполкі.

На Слонімшчыне святкаваць пачалі яшчэ ў мінулыя выхадныя: піянерскія дружыны з усяго раёна сабраліся каля Нязгаснага агню, каб прыняць у свае рады новых супольнікаў. Імпрэза адбылася ў найлепшых традыцыях савецкіх часоў: з павязваннем гальштукаў, выступамі розных кіраўнікоў выканкама, ускладаннем кветак да помніка загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны. І ўсё гэта пад гукі горна ды барабана. Задаволенымі засталіся не толькі дзеці, але і іх бацькі, на якіх наваліліся ўласныя ўспаміны пра шчаслівае савецкае дзяцінства.

Пасля ўрачыстасцей гарадскіх вучняў чакаў драмтэатр, а вясковых — кінатэатр.

Яніна МЕЛЬНІКАВА

СТАТЫСТЫКА

ЯК ЖЫЛА І ПРАЦАВАЛА СЛОНІМШЧЫНА Ў ПЕРШЫМ КВАРТАЛЕ 2004 ГОДА

Нядаўна раённы аддзел статыстыкі зрабіў выкладкі сацыяльна-эканамічнага становішча Слонімскага раёна ў студзені-сакавіку 2004 года. Як звычайна, статыстычныя звесткі падаюцца па галінах народнай гаспадаркі і параўноўваюцца з адпаведным перыядам мінулага года. Мы спыніліся на некаторых з іх.

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

За першы квартал гэтага года прамысловыя прадпрыемствы выпусцілі прадукцыі (выканалі работаў і паслуг) у фактычных цэнах на суму 43 623,4 мільёна рублёў. У параўнанні са студзенем-сакавіком 2003 года аб'ём прамысловай вытворчасці ў супастаўляльных цэнах вырас на 1%.

На 1 красавіка 2004 года ўзровень запасаў гатовай прадукцыі склаў 65,8% ад сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці супраць 73% на адпаведную дату 2003 года.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА. ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ

Сельгаспрадпрыемствамі раёна за студзень-сакавік 2004 года рэалізавана на забой 1 707 тон жывёлы і птушкі. Гэта на 2% менш, чым за той жа перыяд летась. Скарацілі рэалізацыю жывёлы 11 гаспадарак.

На 1 красавіка 2004 года колькасць буйной рагатай жывёлы ў сельгаспрадпрыемствах склала 34 095 галоў і скарацілася на 190 галоў да ўзроўню мінулага года. Пагалоўе свіней склала 29201 галаву супраць 28 135 летась. Колькасць птушкі скарацілася на 3 тысячы галоў і склала 173 тысячы галоў.

Падзеж буйной рагатай жывёлы склаў 194 галавы і зменшыўся ў параўнанні з мінулым годам на 34%, свіней — 1 044 галавы, на 21% больш.

ФІНАНСЫ

Выручка ад рэалізацыі прадуктаў, тавараў, работ і паслуг прадпрыемстваў і арганізацый раёна за студзень-люты 2004 года ў бягучых цэнах склала 49,9 мільярда рублёў, што на 35,1% больш, чым у студзені-лютым 2003 года.

Рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі (работ, паслуг) па эканоміцы раёна склала за два першыя месяцы 2004 года 5,4% супраць 0,7% за той жа час 2003 года. Рэнтабельнасць ад продажу адпаведна 3,6% супраць 0,5%.

Чысты прыбытак за студзень-люты 2004 года склаў 661 мільён рублёў.

Па выніках працы за два месяцы гэтага года 39 арганізацый (41,9% ад агульнай колькасці ўлічаных за гэты перыяд арганізацый) атрымалі 977 мільёнаў рублёў чыстых убыткаў.

Сумарная пратэрмінаваная запазычанасць на 1 сакавіка 2004 года склала 25,3 мільярда рублёў, 96,3% ад гэтай сумы — крэдыторская запазычанасць.

ЗАНЯТАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА І БЕСПРАЦОЎЕ

На 1 красавіка гэтага года ў дзяржаўнай службе занятасці было зарэгістравана 1 156 беспрацоўных. Гэта на 50 чалавек (на 4,5%) больш, чым за адпаведны перыяд мінулага года.

За перыяд з пачатку года прадпрыемствы і арганізацыі прынялі на працу 1 501 чалавека, з іх 27 чалавек — на новыя працоўныя месцы. Звольнена за гэты час па розных прычынах 1 121 чалавек, з іх 58 чалавек звольнены за прагулы і іншыя парушэнні працоўнай дысцыпліны і 54 чалавекі — па скарачэнні штатаў.

ЗАРОБАК

Налічаная сярэднямесячная зарплата па народнай гаспадарцы раёна ў студзені-сакавіку 2004 года склала 232 756 рублёў і павялічылася ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года ў 1,4 раза.

ДЭМАГРАФІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ

За тры месяцы гэтага года ў раёне зарэгістравана 195 нованароджаных і 336 памерлых, з іх гарадскіх жыхароў — адпаведна 143 і 173, вяскоўцаў — 52 і 163.

У параўнанні з адпаведным перыядам 2003 года колькасць нованароджаных павялічылася на 30 чалавек, а памерлых — на 55.

І ў горадзе, і ў вёсцы колькасць памерлых перавысіла колькасць нованароджаных адпаведна на 30 і 111 чалавек.


За студзень-сакавік 2004 года зарэгістравана 70 шлюбаў — на 29 шлюбаў менш, чым за той жа час летась. Скасаванняў шлюбу за гэты перыяд зарэгістравана 44 — на 22 менш, чым за адпаведны перыяд 2003 года.

Падрыхтаваў Мікола КАНАНОВІЧ

ВОЛКОВЫСК

ПО НОВОМУ КРУГУ

Министерство по налогам и сборам (МНС) объявило новую внеплановую комплексную проверку деятельности фирмы "Ника-Транс", партнера волковысского предпринимателя Николая Автуховича.


Николай Автухович и Юрий Леонов

Постановление о проведении проверки было вручено 13 мая директору транспортной фирмы "Ника-Транс" Юрию Леонову. Кроме того, фирма получила ответ, в котором Высший хозяйственный суд (ВХС) фактически санкционировал наложенные в прошлом году экономические санкции.

"Эта проверка с июля — уже пятая только по фирме "Ника-Транс". Очевидно, что нас хотят задавить, разорить, уничтожить, — сказал Автухович. — Я думаю, что не случайно проверка была объявлена именно сейчас. Наверняка МНС уже знало об ответе ВХС".

Волковысская фирма "Ника-Транс" является деловым партнером предпринимателя Николая Автуховича. Вместе они составляют крупнейший бизнес грузо- и пассажироперевозок в регионе. Напомним, что в прошлом году Автухович и 30 водителей "Ники-Транс" около месяца держали голодовку протеста. Причиной стало то, что к предпринимателю и фирме одновременно МНС применило финансовые санкции на общую суму более 700 миллионов рублей и арестовало автомобили, посчитав, что взаимозачеты между партнерами производились с нарушениями.

По мнению налоговых органов, нарушением является схема, использованная Автуховичем при найме водителей машин "такси". После прошлогоднего декрета президента №4, который ограничил количество работников предпринимателя до 3 человек, Автухович уволил почти весь свой штат и устроил их на работу в фирму "Ника-Транс". Затем между фирмой и предпринимателем был заключен договор "о предоставлении труда водителей". В экспертном заключении Главное управление Национального банка, законодателя в области финансовых взаиморасчетов, оценило эту схему как законную.

Однако суды, куда обратились Автухович и "Ника-Транс", приняли по одной и той же схеме абсолютно противоположные решения. В марте Высший хозяйственный суд (ВХС), рассматривая те же обстоятельства в отношении "Ника-Транс", признал "Нику-Транс" нарушителем, хотя исполнение санкций в отношении нее приостановил. А через месяц Гродненский областной хозяйственный суд принял решение в пользу Автуховича и отменил все санкции.

"Я не верю в то, что проверка МНС будет проведена законно и беспристрастно. Я уже давно слышу, что на меня ищут хоть какой-нибудь компромат, — говорит Автухович. — Государственная структура ведь не может проиграть или дать задний ход! Поэтому я не удивлюсь, если против меня будет организована какая-нибудь акция или провокация".

Ирина ЧЕРНЯВКА

НОВОСТИ

"РЕПОРТЕРЫ БЕЗ ГРАНИЦ" ВЫСТУПАЮТ ПРОТИВ ОБЫСКА РЕДАКЦИИ ГАЗЕТЫ "ДЕНЬ"

ГРОДНО. Международная организация "Репортеры без границ" выступают против проведенного 11 мая управлением КГБ по Гродненской области обыска редакции независимой еженедельной газеты "День". Об этом говорится в заявлении организации, распространенном 12 мая.

Как сообщается в документе, трехчасовой обыск проводился по приказу заместителя прокурора Гродненской области Владимира Ониско. Сотрудники КГБ искали аппаратуру, на которой могли быть напечатаны листовки, появившиеся в Гродно в начале мая, содержащие стихотворение с критикой правления президента Лукашенко. По факту оскорбления чести и достоинства президента было возбужденно уголовное дело. В результате обыска сотрудники КГБ изъяли четыре офисных компьютера.

Редактор "Дня" Николай Маркевич отрицает причастность редакции к изготовлению листовок. "Этот обыск был просто еще одним шагом в кампании властей против независимых СМИ в преддверии парламентских выборов осенью 2004 года", — считает Н. Маркевич.

Организация "Репортеры без границ" 12 мая также направила письмо министру внутренних дел Беларуси Владимиру Наумову. В нем, в частности, говорится: "Мы негодуем по поводу методов, применяемых властями, особенно КГБ, с целью не позволить журналистам газеты "День" нормально работать".

Организация призвала В. Наумова "положить конец этому недопустимому преследованию и обеспечить возврат компьютерного оборудования, изъятого у редакции в процессе обыска".

Ольга ЛАПИКОВА

САПЁРАМ ВСЕГДА ЕСТЬ РАБОТА

БРЕСТСКАЯ ОБЛАСТЬ. Группа разминирования саперного батальона 11-й механизированной бригады в Ляховичах обезвредила очередной боеприпас второй мировой войны.

Работающий в поле тракторист в буквальном смысле слова прошелся по 152-миллиметровому снаряду, который был в хорошем состоянии. Начальник группы разминирования старший прапорщик Владимир Лямзин со своими подчиненными, как всегда, справился со своей задачей на высоком профессиональном уровне.

Как сообщает агентство БелаПАН, 11 мая в Ивацевичах на предприятии «Вторчермет» было обнаружено 9 авиационных бомб. Авиабомбы отделены от остального металла и взяты под охрану.

Являются ли обнаруженные боеприпасы учебными или боевыми, предстоит выяснить специалистам воинской части из Слонима. Пресс-служба МЧС сообщает, что их либо вывезут за пределы города и уничтожат — в случае если снаряды окажутся боевыми, либо разрежут на лом.

Александр ЗАХАРЕНКО

КАНТРАКТЫ НЕПАТРЭБНЫЯ

МАСТЫ. Менавіта так выращыла дырэктар Мастоўскага камбіната бытавога абслугоўвання Яўгенія Грыгарэнка. Яна выступіла супраць падпісання кантрактаў з рабочымі прадпрыемства.

На яе думку, адным простым кантрактам даходаў не павысіш, а вось выдаткі, звязаныя з гарантаваным павелічэннем заработнай платы, прымусяць прадпрыемства несці страты.

Антон МАКЕЙ

МАСТЫ

ПАЗБАЎЛЯЮЦЬ ЖЫЛЛЯ

Амаль дваццаць сем'яў, што жывуць у будынках, якія належаць адкрытае акцыянернае таварыства "Мастоўдрэў" і якія знаходзяцца побач з ім, атрымалі паведамленне за подпісам генеральнага дырэктара прадпрыемства, што ім неабходна да канца чэрвеня выселіцца з гэтых памяшканняў. У лісце не ўказвалася, ці дадуць людзям іншую жылую плошчу.

Гэтыя будынкі неабходна зносіць. Іх лёс вырашыўся яшчэ ў сярэдзіне васьмідзесятых. Тады кіраўніцтва горада вырашыла стварыць экалагічную зону вакол прадпрыемства, раз яго вытворчасць з'яўляецца шкоднай і ў атмасферу трапляюць рэчывы, якія псуюць здароўе людзей.

Да пачатку дзевяностых гадоў значную частку дамоў, якія знаходзілася ў гэтай зоне — на вуліцах Савецкай, 30 гадоў УЛКСМ, у перавулку Доўгім, — знеслі, а іх жыхарам далі іншае жыллё. Пасля працэс стварэння гэтай зоны спыніўся болей як на дзесяць гадоў.

Пытанне, якое ўзнікла, даволі складанае. Паводле неафіцыйных звестак, цяперашні старшыня райвыканкама Віктар Кудзеля выклікаў дэпутата райсавета, які балатуецца па гэтай выбарчай акрузе, і прапанаваў разабрацца ў гэтай сітуацыі.

Людзі не збіраюцца высяляцца з дамоў, бо ім проста няма куды падзецца.

Антон МАКЕЙ

ПРОСЬБА ПОЗВОНИТЬ

3 марта 2004 года примерно в 13 часов на 141 км автодороги Слоним – граница Литвы, за д. Тальковщина Слонимского района, произошло столкновение автомашин «Хонда-Аккорд» и ВАЗ-21011, двигавшихся во встречном направлении.

Очевидцев данного ДТП просьба позвонить в СО ОПР Слонимского РОВД по телефонам: **2-35-41, 2-51-02, 2-11-12.**

СОБОЛЕЗНОВАНИЕ

Глубоко и искренне скорбим по случаю смерти участника Великой Отечественной войны, ветерана органов МВД Александра Харитоновича Халецкого и выражаем глубокое соболезнование родным и близким покойного.

Совет ветеранов, сотрудники Слонимского РОВД

НАЛАДЗІЛІ "МАСТЫ НАДЗЕІ"

МАСТЫ. 16 траўня ў Мастоўскім раённым доме культуры адбыўся чацвёрты абласны фестываль дзіцячай эстраднай творчасці.

У ім узялі ўдзел дзіцячыя мастацкія калектывы ўсіх раёнаў вобласці і Гродна. Палітра выступленняў была самай разнастайнай, як і ўзрост удзельнікаў. Перад журы і гледачамі экзамен трымалі як салісты, так і дуэты, трыо, харавыя калектывы, студыі. Гледачы не толькі слухалі спевы, але віталі заліхвацкія танцы.

Журы таксама было шчодрае на прызы і дыпломы. Іх атрымалі амаль усе ўдзельнікі фестывалю, бо намінацый сярод розных узроставых груп было столькі, што ўзнагароджанне доўжылася болей як гадзіну.

Гран-пры фестывалю заваявала Анжэліка Суратчы са студыі эстрадных спеваў з Гродна.

Немалы поспех выпаў на долю слонімцаў. Дыпламантамі фестывалю сталі дуэт Яўгена Ільчанкі і Андрэя Белаброва са школы №2, узорны тэатр эстрадна-спартыўнага танца "Каскад" раённага дома культуры (дзве ўзроставыя групы). Самую юную ўдзельніцу конкурсу са школы №8 узнагародзілі спецыяльным прызам Мастоўскага БРСМ. Сярод удзельнікаў былі Джаміля Шэгідзевіч (СШ №2), Магамед Голубеў (Кастровіцкі цэнтральны дом культуры), Вікторыя Балыкіна (СШ №8), Надзея Чачэт (студыя эстрадных спеваў "Камея").

Таксама дыпломы і каштоўныя падарункі атрымалі вакальны ансамбль Дзярэчынскага цэнтральнага дома культуры Зэльвенскага раёна, Яўген Венскі з Жукоўшчынскай сярэдняй школы Дзятлаўскага раёна.

Ад Мастоў на сцэну выходзілі Арцём Трачоў (узорная студыя эстрадной песні "ФанТон"), дуэт Наталля Ягорава і Павел Забелін (школа мастацтваў), Андрэй Грыгор'еў (студыя "ФанТон") і Вольга Грыб (раённы Дом культуры).

Яшчэ ўсяму станоўча адзначыла калектыў работнікаў раённага Дома культуры ў арганізацыі правядзення фестывалю.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ІНТЭРВ'Ю

ЮРЫ КАЧУК: "ТРЭБА ЗАСТАВАЦЦА ПАНАМ СВАЙГО СУМЛЕННЯ"

Гэткія людзі ёсць у кожным раённым горадзе. Яны — галаўны боль для мясцовых уладаў, яны стараюцца данесці да людзей альтэрнатыўную інфармацыю. Пра іх згадваюць у сталіцы хіба падчас чарговых палітычных кампаній, паміж якімі жыццё гэтых людзей далёка не салад. Мой госць — кіраўнік Зэльвенскай раённай рады КХП БНФ Юры Качук.



■ Помнік Ларысе Геніюш у Зэльве

— Юры, пачнем нашую гутарку з таго, што ты, чалавек з вышэйшай адукацыяй, працаглы час нідзе не працуеш. Чаму?

— Я беспрацоўны ўжо пяць гадоў, з часу прэзідэнцкіх выбараў 1999 года, калі маю пасаду ў Цэнтры навучання пажарнай бяспецы скарацілі. Стаў на ўлік у бюро працаўладкавання, шукаў працу і самастойна, бо спадзеву на тое бюро мала. На ўсіх зэльвенскіх прадпрыемствах начальнікі толькі адмахваліся: "Ты што, хочаш, каб нас саміх звольнілі?" А намесніца старшыні райвыканкама Алена Коўш адкрытым тэкстам заявіла: "Да бээнэфаўцаў у нас даверу няма!" А я быў згодны на любую працу, нават у аранжавай камізэльцы вуліцы падмятаць.

— Ты выдаеш краязнаўчы часопіс "Бэз". Скажы колькі слоў пра гэтае выданне як галоўны рэдактар.

— Задума выдаваць свой часопіс была ў мяне даўно. Мая мэта — абудзіць дух чалавека, даць магчымасць для самавыяўлення асобы. Своеасаблівы дэвіз "Бэзу": "Сёння — чытач, заўтра — аўтар". Першы нумар часопіса выйшаў накладам усяго 120 асобнікаў, а другі, з улікам чытацкага попыту, — 250 асобнікаў. У ім 76 старонак, паўтара дзесятка аўтараў.

Часопіс распаўсюджваю бясплатна, але і паштовыя расходы не па кішэні беспрацоўнаму. Разношу па бібліятэках і часопіс, і газету "Зяльвяначка", якой, не зважаючы на перашкоды мясцовых уладаў, выйшла ўжо 10 нумароў. А рэдагуе "Зяльвяначку" мая дачка Юля.

— Гэткі сабе мясцовы выдавецкі сіндыкат: бацька выдае часопіс, дачка — газету.

— Так атрымліваецца. Дачка і жонка набіраюць тэксты, я шыхтую, потым вязу ў Гродна на друк. Вядома, хацелася б зарэгістраваць гэтыя выданні, стварыць некалькі працоўных месцаў. Але пакуль гэта нерэальна.

— На нашу гутарку ты прыйшоў з толькі што выдадзенай кнігай "Памяць" пад пахай. Нядаўна на ўрадавым узроўні прынялі рашэнне закончыць сёлета выданне раённых хронікаў. Падзяліся ўражаннямі ад прачытання кнігі.

— У гэтай "Памяці" столькі памылак і казусаў, што ствараецца ўражанне: яе да выпуску ніхто не чытаў. Пакрыўдзілі нават цяперашняга старшыню Зэльвенскага райвыканкама, няправільна надрукаваўшы яго прозвішча. Памылак — безліч. Прывяду некалькі прыкладаў. У кнізе напісана, што вайна з Маскоўскай дзяржавай вялася чамусьці ў адваротным часавым парадку: пачалася ў 1654-м, а скончылася ў 1600-ым годзе. У кнізе змешчана геаграфічная карта, паводле якой, каб трапіць з вёскі Бярэжкі ў вёску Збляны, трэба пераплысці Зэльвенскае вадасховішча, хаця гэтыя вёскі знаходзяцца на адным баку вадасховішча на невялікай адлегласці адна ад другой. Адзін са здымкаў у кнізе ўвогуле надрукаваны дагары нагамі!

— Няўжо ў кнізе на 600-ах старонках няма цікавай і карыснай інфармацыі?

— Ёсць, і нямала. Аналізуючы "Памяць", можна смела назваць адну з цэнтральных вуліц Зэльвы — 17 Верасня — вуліцай Вызвалення ад дабрабыту. Бо пры Польшчы, працуючы ў пана, работнік мог за дзень зарабіць на кілаграм дарагога тады цукру, а ў калгасе 50-ых гадоў ён зарабляў на той жа кілаграм цукру, працуючы без выхадных цэлы год! Вялікае абурэнне выклікае і азначаны ў "Памяці" факт жудаснага забойства ў Зэльве ў 1939-ым годзе саветамі праваслаўнага і каталіцкага святароў. У рубрыцы "Вернутыя імёны" я знайшоў у "Памяці" свайго прадзеда, якога ў 1940-ым ва ўзросце 72-ух гадоў выслалі ў далёкі Казахстан.

Шкада, што "Памяць" накладам 3 000 асобнікаў немагчыма набыць, бо ўсе кнігі знаходзяцца ва ўласным распараджэнні намесніцы старшыні райвыканкама па ідэалогіі Алены Коўш і выдаюцца толькі пэўным людзям.

— З паўгода таму наша радыё паведамляла, што зэльвенскія ўлады збіраліся знесці помнік Ларысе Геніюш. Яны яшчэ не адмовіліся ад гэтай задумы?

— Не адмовіліся, і пагроза помніку застаецца. Ёсць інфармацыя: пасля прыезду абласной "вертыкальшчыцы" Марыі Біруковай улады інспіравалі збор подпісаў сярод жыхароў Зэльвы, асабліва сярод ветэранаў, каб знесці помнік. Зэльвенцы ж да гэтага ставяцца адмоўна, бо яшчэ жывуць тыя, хто памятае Ларысу Геніюш. З часу ўсталявання помніка жыхары Зэльвы тэлефануюць мне і пытаюцца пра далейшы лёс помніка, прапаноўваюць грошы для ўпарадкавання месца каля помніка, а скульптар Алесь Шатэрнік на грамадскіх пачатках зрабіў шыльду, якую неўзабаве ўсталююць на помніку.

А ў мяне ўзнікла і новая задума: устанавіць помнік яшчэ аднаму слыннаму сыну Зэльвеншчыны — прэзідэнту БНР Васілю Захарку. У хуткім часе ўсе неабходныя дакументы будуць пададзеныя ў райвыканкам. Помнік прапануецца ўстанавіць на цэнтральным пляцы, прыбраўшы пакінутага без нагляду Леніна. Раней ці пазней — помнік прэзідэнту БНР у Зэльве будзе!

— Мне нядаўна трапіла ў рукі вашая мясцовая прэса. Я там прачытаў, што ў Зэльве жывуць "запалоханыя людзі". Хто і чым іх запалохаў?

— Я не сказаў бы, што ў Зэльве людзі больш запалоханы, чым у другіх месцах. Застрашванне людзей адбываецца асабліва ў апошнія гады. Людзі не заўважылі, як улады, гэтыя "слугі народа", пачалі кіраваць гэтым народам. "Слугі" вырашаюць, колькі плаціць свайму гаспадару, на якой мове гаварыць, якога суседа любіць... А сваю некампетэнтнасць ва ўсіх справах спіхваюць на развал СССР, прымушаюць людзей галасіць па гэтай змерлай імперыі зла. А Ларыса Геніюш пісала: "З пекла ўпала на голаў мне ўся гэта СССР". Можа, яшчэ трэба галасіць па змерлых мамантах, бо мяса дарагое ў крамах і пенсіянеры ледзь перабіваюцца хлебам і кефірам, заплаціўшы за камунальныя паслугі? А пры СССР мяса ў зэльвенскіх крамах увогуле не было, адны "ногі ды рогі" ляжалі.

Сёння ў Зэльвенскім раёне адбываецца тое ж, што і ўсюды на Беларусі: у любы момант можна страціць працу, плата за жыллё касмічная. Вось адкуль бярэцца страх, які паступова пераходзіць у апатыю, чалавек паступова ператвараецца ў зомбі, якім лёгка кіраваць.

— А каб не быць зомбі, што трэба рабіць? Як застацца чалавекам, каб карозія страху не раз'ядала душы?

— Ведаеш, чаму ўладам замінае помнік Ларысе Геніюш? Бо творчасць Геніюш абуджае сумленне ў чалавеку, яна — маральны аўтарытэт, яна дапамагае выганяць з сябе раба, гэтак патрэбнага любой уладзе. Але ў самы неспрыяльны і змрочны час, калі навокал столькі хлусні і чалавечай подласці, трэба заставацца панам свайго сумлення. Іншага рэцэпта я не ведаю.

Гутарыў
Міхась СКОБЛА, Зэльва

НОВОСТИ

БУДУТ СВОИ ДИАБЕТИЧЕСКИЕ НАПИТКИ

ЛИДА. ОАО "Лидское пиво" планирует к началу летнего сезона начать выпуск новой серии безалкогольных газированных напитков под маркой "Фрукто".

Как сообщила БелаПАН главный технолог предприятия Валентина Багровец, напитки с пятью фруктовыми вкусами будут изготавливаться на основе фруктозы без добавления сахара, что позволит использовать их для диетического питания.

Кроме того, сообщила В. Багровец, на предприятии завершается реконструкция варочного цеха, где по чешской технологии из чешского солода и хмеля, а также с привлечением специалистов из Чехии будет выпускаться новое пиво.

Реконструкция варочного цеха позволит также увеличить объем ежегодно производимого пива с 2,5 до 4,5–5 млн. дал, улучшить качество продукции и увеличить срок хранения "живого" непастеризованного пива до полугода. По данным предприятия, за три месяца этого года "Лидское пиво" произвело 730 тыс. дал пива, что на 22,3 процента больше, чем в январе–марте прошлого года.

Лавиния ОРЕШКО

ПЕРАХОДАЎ БУДЗЕ БОЛЬШ

ГРОДНА. Шэсць новых пунктаў пропуску адкрыюцца ў Гродзенскай вобласці.

Тры пераходы на працягу найбліжэйшых двух гадоў з'явяцца на беларуска-польскай мяжы. Столькі ж міжнародных пунктаў пропуску адкрыюцца за гэты час і на мяжы з Літвой. Да такога рашэння прыйшлі знешнепалітычныя ведамствы Беларусі, Літвы і Польшчы.

АТН

БЕЗРАБОТНЫМ ПЛАТЯТ КАРТОШКОЙ

ГРОДНО. Только половина безработных области получает пособие по безработице. В Гродно эта цифра еще ниже — третья часть состоящих на учете в службе занятости поддерживается денежно. Более 15 тысяч жителей Гродненской области состоят на бирже труда, из них свыше 5 тысяч — в городе.

По данным управления областной службы занятости, за три месяца этого года зарегистрировано безработными более восьми тысяч, трудоустроено четыре с половиной тысячи человек. В качестве альтернативы постоянной работе центры занятости предлагают оплачиваемый общественный труд. За день на посевной в хозяйстве можно заработать 5–8 тысяч рублей или получить оплату бартером — картошкой, консервами.

Ежедневно на полевые работы отправляется по 300 человек. По словам директора городского центра занятости Людмилы Рез, пособие по безработице сегодня интересует все меньше людей, сообщает www.hrodna.by со ссылкой на "Вечерний Гродно". Связано это с его мизерной величиной: средний размер — 23 тысячи, максимальный — 38 тысяч рублей.

«БДГ»

ПЕРШЫЯ КРОКІ Ў ЖУРНАЛІСТЫЦЫ

ГРОДНА. Гродзенскае грамадскае аб'яднанне "Цэнтр інфармацыйнай падтрымкі грамадскіх ініцыятыў "Трэці сектар" у межах праекта "Адкрытасць. Інфармаванасць. Дыялог" арганізавала і правяла ў Гродне заняткі ў Школе маладых журналістаў.

У мінулую нядзелю юныя журналісты нашай вобласці здалі экзамены і атрымалі спецыяльныя пасведчанні. Авалодалі ведамі ў галіне журналісткі і юнакі і дзяўчаты са Слоніма. Гэта Антон Трафімовіч, Таццяна Плахетка, Ірына Арлова, Дзмітрый Нічыпар, Таццяна Куравчыкна, Вольга Якусяня і Аксана Валюкевіч. Прозвішчы некаторых з іх чытачы сустракалі на старонках нашай газеты. Дарэчы, Антон Трафімовіч быў прызнаны найлепшым журналістам і атрымаў за гэта дыплом.

Вынікам усёй дзейнасці Школы стаў выпуск газеты "Jeans".

Сяргей ЧЫГРЫН

АБАНЕНЦКІ АДДЗЕЛ САМЫ СІМПАТЫЧНЫ

МАСТЫ. На мінулым тыдні ў Гродне абласное аддзяленне "Белтэлекам" правяло спаборніцтвы сярод абаненцкіх аддзелаў раённых вузлоў сувязі на іх прафесійнае майстэрства.

Ад мастоўскіх сувязістаў выступалі Вольга Кучун і Валеры Сямашка. Яны дамагліся прызоў сімпатый гледачоў.

Антон МАКЕЙ

ЗДАРЭННІ

РАКАВАЯ ПАМЫЛКА

ВАЎКАВЫСК. У ваўкавыскую бальніцу з сімптомамі атручвання быў дастаўлены цясляр адной мясцовай будаўнічай арганізацыі.

Нягледзячы на ўсе старанні медыкаў, праз два тыдні мужчына памёр у бальніцы. Аказалася, што замест спіртнога ён на працы адпіў з бутэлькі электраліт.

МАЦІ З ДАЧКОЙ АБРАБАВАЛІ ХАТУ ЗЕМЛЯКА

ДЗЯТЛАВА. 40-гадовы жыхар Гродна звярнуўся з заявай у Дзятлаўскі РАУС аб тым, што невядомыя абрабавалі яго нежылы дом у вёсцы Руда-Яварская.

З восені мінулага года і да красавіка гэтага няпрошаныя госці праз акно залазілі ў пустую хату, адкуль вынеслі пасцельныя прыналежнасці, дзіцячую каляску і скураную куртку.

Супрацоўнікі аператыўна-следчай групы крадзеж раскрылі. Аказалася, што да свайго земляка ў час яго адсутнасці ў госці наведваліся 35-гадовая даярка і яе дачка, дзевяцікласніца мясцовай школы. Указ "Аб амністыі" выратаваў маці з дачкой ад крымінальнай адказнасці.

Мікола КАНАНОВІЧ

Дорогая и любимая сестра, тетя

Татьяна Ивановна ШЕСТАКОВА!

Сердечно, с теплотой и нежностью поздравляем тебя с 55-летием!

*Годы, годы, словно птицы,
Незаметно пролетят.
Было 20, было 30, а сегодня – 55.
Ну и что, что 55,
Ведь не гнутся плечи,
И глаза еще блестят, и еще не вечер.
Улетают годы, словно пух тополей,
Не грусти, провожая их взглядом.
Ведь годы не беда и совсем ерунда,
Коль семья и друзья с тобой рядом.*

Любящие тебя сестра Людмила, племянник Юрий

Уважаемая

Зоя Антоновна АБРАМОВИЧ!

В день Вашего рождения мы рады выразить наши искренние поздравления и пожелать Вам всяческих благ!

*Как сегодня нам хочется
Пожелать от души
Вам здоровья, и радости,
И всех благ на пути.
Желаем Вам не стариться,
Из года в год цвести,
Улыбку, счастье, молодость
Всегда с собой нести.*

С уважением коллектив ГПТУ-129

Дорогую, любимую доченьку, сестричку и мамочку

Татьяну Владимировну КОЗЕЛЕЦКУЮ

от всей души поздравляем с 25-летием!

*С днем рожденья, дорогая,
Поздравляем от души!
Тост поднять за твое счастье
Мы давно уже спешим.
Пусть уходят все невзгоды,
И печали пусть уйдут,
Только радость тебе, Татьяна,
Твои годы пусть несут.
Будь веселой, и счастливой,
И красивой, как сейчас,
Пусть сопутствует удача
Каждый день и каждый час.*

Любящие тебя мама, брат Ваня и сыночек Кирилка

Любимого мужа и папу

Андрея Анатольевича ЯРОША

поздравляем с 25-летием!

